**Шулаеў А.Л.**

# КОМПЛЕКСНАЯ АХОВА АБ’ЕКТАЎ СПАДЧЫНЫ І ПАНЯТАК КУЛЬТУРНАГА ЛАНДШАФТУ

Мінск, Рэспубліка Беларусь

На сённяшні момант існуе праблема забеспячэння комплекснай аховы аб’ектаў гісторыка-культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь. Пад комплекснай аховай аб’екта спадчыны разумеецца падыход да яго не як да аб’екта ў сабе, але як да элементу гісторыка-культурнага ландшафту. Разам з тым, беларускае заканадаўства ў галіне аховы гісторыка-культурнай спадчыны прадугледжвае аб’ектна-арыентаваны падыход да аховы гэтай спадчыны. Дзеля аховы гістарычнага аб’екта ў дзеючым Заканадаўстве прадугледжаныя ахоўныя зоны з прапісанымі рэжымамі вакол яго, аднак само асяроддзе, сам гістарычны ландшафт аб’ектам аховы не з’яўляецца.

Што праўда, ужо ў законе Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь ад 2006 г. у артыкуле 12 “Віды гісторыка-культурных каштоўнасцей. Комплексныя гісторыка-культурныя каштоўнасці” Главы 3 закладзены прынцып камплекснай каштоўнасці: “Матэрыяльныя гісторыка-культурныя каштоўнасці могуць з’яўляцца комплекснымі матэрыяльнымі гісторыка-культурнымі каштоўнасцямі, калі:

2.1. два і больш матэрыяльныя аб’екты сабраны разам па пэўных прыкметах і (або) размешчаны побач (пры гэтым у склад комплекснай нерухомай матэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці як асобны кампанент можа быць уключана навакольнае асяроддзе);

2.2. два і больш матэрыяльныя аб’екты аб’яднаны агульнымі прыкметамі і размешчаны ў розных месцах.” [1]

Разам з тым, сярод падвідаў ахоўваемых гісторыка-культурных каштоўнасцяў у згаданым законе азначэнне комплекснага культурнага ландшафту дадзенае ў тэзісна і не акрэслівае усёй тыпалогіі культурных ландшафтаў, распрацаванай на сённяшні дзень у сусветнай тэорыі комплекснай аховы спадчыны

На сённяшні дзень склалося тры прынцыпова розных разумення тэрміну “культурны ландшафт”:

- “добры” антрапагенны ландшафт, зменены чалавекам згодна з пэўнай праграмай, які валодае высокімі эстэтычнымі якасцямі;
- мясцовасць, што на працягу доўгага гістарычнага перыяду з’ўлялася месцам пражывання пэўнай групы людзей, якія з’яўляюцца носьбітамі спецыфічных культурных каштоўнасцяў;
- ландшафт як інфарматыўны аб’ект і суб’ект, створаны ў выніку інтэлектуальнай і духоўнай дзейнасці і які з’яўляецца крыніцай інфармацыі пра такую дзейнасць. [2]

Разуменне культурнага ландшафту як аб’екта спадчыны



Рэпазіторый ВДУ

знайшло адлюстраванне ў дакументах Юнеска, у прыватнасці, у 1992 г. такі панятак быў уключаны ў тэкст Кіроўных указанняў ЮНЕСКА па ўжыванні Канвенцыі аб Сусветнай спадчыне (Operational Guidelines for the Implementation of the World Heritage Convention, UNESCO, з дапамогай якога адбываецца рэалізацыя палажэнняў Канвенцыі.

Пры рэалізацыі мерапрыемстваў па ахове аб'ектаў матэрыяльнай нерухомай гісторыка-культурнай спадчыны аўтар прапануе аб'яднаць аб'ект з яго гістарычным асяроддзем у якасці аднаго з элементаў суцэльнага інфарматыўнга па сутнасці культурнага ландшафту з тым, каб:

- разглядзець аб'ект гісторыка-культурнай спадчыны на прынцыпова новым якасным узроўні і комплексна;
- павялічыць ступень эфектыўнасці захадаў, што ўжо скіраваныя на ахову аб'екта спадчыны ў межах дзеючага заканадаўства;
- павялічыць узровень і ступень навуковага асэнсавання гістарычных аб'ектаў праз разгляд гэтых аб'ектаў як выніка розначасовых і рознапланавых культурна-гістарычных працэсаў, выяўленне сувязі паміж рознымі аб'ектамі спадчыны праз пасярэдніцтва "матэрыі" Культурнага ландшафту. [3]

Паводле Кіроўных указанняў ЮНЕСКА культурныя лндшафты падзяляюцца на:

1. мэтаскіравана створаныя (аб'екты ландшафтнай архітэктуры, створаныя па пэўнай праграме, якія валодаюць пэўнымі эстэтычнымі якасцямі);

2. натуральна развітыя (ландшафты, якія натуральна развіваліся як вынік суіснавання чалавека і прыроды, дзе прыродныя чыннікі змяняліся пад уплывам чалавечай дзейнасці і фармавалі адпаведны ландшафт, падзяляюцца на рэліктавыя ландшафты і ландшафты ў стадыі развіцця);

2.1. рэліктавыя ландшафты (яшчэ называюцца "выкапнёвымі", захоўваюць у сабе культурныя сляды, што ня маюць працягу ў сучаснасці (археалагічныя, палеанталагічныя), часта ў акружэнні інакшага культурнага і/ці прыроднага асяродку);

2.2. ландшафты ў стадыі развіцця (рэпрэзентуюць геаграфічна акрэсленыя традыцыйныя культуры і да т.п.);

3. асацыятыўныя (ландшафты, якія асацыятыўна звязаныя з пэўнымі культурнымі маркерамі, падзеямі, сакральнымі месцамі). [2]

Аўтар прыводзіць прыклад уласнай правапрымяняльнай практыкі па ахове гісторыка-культурнай спадчыны, калі, у супрацы з Мясцовым дабрачынным фондам "Крэўскі замак" ініцыяваў уключэнне ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурнай спадчыны элемента культурнага ландшафту "Юрава гара" ў в. Крэва Смаргонскага раёну Гродзенскай вобласці Рэспублікі Беларусь, матывааўшы такі крок спецыфікай культурнага ландшафту і



Репозиторий ВГУ

пагрозай неапраўдных зменаў. [4] Атрымаўшы адказ аб неабходнасці дадатковага абгрунтавання ініцыятывы па ўключэнні Юравай гары ў спіс спадчыны, а таксама аб неакрэсленасці катэгорыі культурнага ландшафту ў дзеючым заканадаўстве, Інстытутам гісторыі НАН Беларусі на замову фонда былі праведзеныя археалагічныя даследванні на гары [5]. Даследванні выявілі археалагічны культурны пласт перяду Сярэднявечча, звязаны з аб'ектам спадчыны Крэўскім замкам. Гэта лішнім разам ілюструе патрэбу ў больш дэтальнай распрацоўцы палажэнняў закона аб ахове спадчыны датычна культурнага ландшафту, а таксама даказвае, што ахова культурнага ландшафту, як комплекснай гісторыка-культурнай каштоўнасці спрыяе захаванню рознай спадчыны, часам яшчэ ня выяўленай.

На падставе разгледжанага матэрыялу аўтарам, сярод астатняга, прапануецца ўнясенне зменаў у дзеючае заканадаўства аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь у частцы ўключэння новага віда ахоўваемага аб'екта - "Элемент культурнага ландшафту". Магчымасць здзяйснення аховы элементаў культурнага ландшафту адпавядае сусветнай практыцы аховы спадчыны і дазволіць больш эфектыўна вырашаць пытанні комплекснай аховы аб'ектаў гісторыка-культурнай спадчыны пры рэалізацыі прынятых Урадам Рэспублікі Беларусь праграмаў, скіраваных на ахову гісторыка-культурнай спадчыны.


1. Закон Рэспублікі Беларусь "Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь" ад 9 студзеня 2006 г. № 98-З.
2. Веденин Ю.А., Кулешова М.Е., Чалая И.П.и др. Определение формата культурного ландшафта (как составная часть работы по формированию Российской сети культурного наследия) [Электронный ресурс] http://future.museum.ru - Режим доступа: http:// future.museum.ru/part03/030203.htm. - Дата доступа 12.03.2012.
3. Веденин Ю.А., Кулешова М.Е. Культурные ландшафты как категория наследия [Электронный ресурс] http://heritage.unesco.ru - Режим доступа: http://heritage.unesco.ru/index.php?id=101&L=9. - Дата доступа 08.07.2011.
4. Шулаеў, А. Гістарычны цэнтр вёскі Крэва. Праект зон асаблівага рэжыму рэканструкцыі. Дыпломны праект (п/кір. др. арх. С. Сергачова, канд. арх. У. Трацэўскага). - Мн.: БНТУ. Кафедра жылых і грамадскіх будынкаў, 2006
5. Справаздача па археалагічных дследаваннях (раскопках) у в. Крэва Смаргонскага р-на Гродзенскай вобл. у 2011 г. - Мн.: ДНУ "Інстытут гісторыі НАН Беларусі", 2012.



**Мартыненко И.Э.**


## ИНСТИТУАЛИЗАЦИЯ НОВОЙ ОБРАЗОВАТЕЛЬНОЙ ПРОГРАММЫ «МЕЖДУНАРОДНАЯ И НАЦИОНАЛЬНЫЕ ПРАВОВЫЕ СИСТЕМЫ ОХРАНЫ ИСТОРИКО-КУЛЬТУРНОГО НАСЛЕДИЯ СТРАН СНГ»


Гродно, Республика Беларусь


Сфера историко-культурного наследия – уникальное по своей значимости явление человеческой цивилизации. При бурном развитии




Репозиторий ВГУ